***Калеснікові́ч С. Р.**, настаўніца пачатковых класаў Пінкавіцкай сярэдняй школы імя Якуба Коласа Пінскага раёна*

# Сказы з аднароднымі членамі, знакі прыпынку ў іх
# Беларусская мова. IV клас

***Мэта:*** паўтарэнне і падагульненне ведаў школьнікаў па асноўных пытаннях тэмы.

***Задачы:***

- працягваць знаёмства вучняў з аднароднымі членамі сказа;
- развіваць уменне лагічна і доказна выкладаць думкі;
- удасканальваць пунктуацыйныя навыкі (пастаноўка, абгрунтаванне знакаў прыпынку);
- стварыць сітуацыі для развіцця самастойнасці вучняў, навыкаў сама- і ўзаемакантролю;
- выхоўваць любоў да роднага краю, да прыроды.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларуская мова», ч. 1 (Свірыдзенка В. І., 2018).

**І. Арганізацыйны этап. Псіхалагічны настрой.**

Весела гучыць званок,
Яго голас нам знаёмы,
Запрашаем на ўрок
Беларускай мовы!

— Добры дзень. Усе падрыхтаваліся да ўрока? Сядайце.

— Няхай сённяшні дзень для вас будзе спрыяльным, а ўрок будзе для вас удалым і плённым. «Аднойчы вучні звярнуліся да свайго настаўніка з пытаннем,

які дзень тыдня самы спрыяльны, каб пачаць новае жыццё, каб стаць паспяховым, удалым, шчаслівым. Можа, гэта серада?

Настаўнік падумаў і адказаў вучням…»

— Як вы думаеце, які дзень тыдня назваў настаўнік?

«Настаўнік падумаў і сказаў: Гэты дзень тыдня называецца *сёння*».

— Вы згодны з мудрым настаўнікам?

**II. Мэтавызначэнне.**

— Вось і мы з вамі сёння паспрбуем выканаць усё тое, што запланавалі. Як вы думаеце, над якой тэмай мы будзем працаваць на ўроку?

Настаўнік разам з вучнямі фармулюе тэму.

**III. Праверка дамашняга задання.**

— І пачнем нашу работу з праверкі дамашняга задання.

С. 63, пр. 100.

Вучні чытаюць сказы з аднароднымі членамі, тлумачуць пастаноўку коскі або яе адсутнасць.

**IV. Этап удасканалення каліграфічных навыкаў.**

— Запішыце дату, класная работа.

— Калі вы згодны з маім выказваннем пішыце літарку ***Л***, а калі не — ***л***:

- галоўныя члены сказа — гэта дзейнік і выказнік;
- дзейнік адказвае на пытанні *што рабіў?*, *што зрабіў?*, *што будзе рабіць?*;
- у сказе аднародныя члены сказа могуць быць дзейнікамі, выказнікамі і даданымі членамі сказа;
- калі два аднародныя сказы звязаны злучнікам ***і***, то паміж імі ставіцца коска.

— Далей да канца радочка прапішыце чаргуючы літару ***Л, л***.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

На дошцы размешчаны схемы па тэме «Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі». Дзецям прапануецца ўважліва разгледзіць схемы і выправіць памылкі, калі яны ёсць.

***Знаёмства са слоўнікавым словам.***

— Сёння мы пазнаёмімся з новым слоўнікавым слова — *ледзьве.* Дзе можна дапусціць памылкі пры яго напісанні?

— Запішам гэтае слова ў сшытках. На які склад падае націск? Колькі складоў у гэтым слове? Як гэтае слова перакладаецца на рускую мову? *(Едва.)*

— Прыдумайце сказ са словам *ледзьве.*

— Запішам сказ, падкрэслім галоўныя члены сказа.

— Разгледзьце малюнак. Прыдумайце сказ з аднароднымі членамі па дадзеным малюнку: 1) Паштальён Печкін развозіць газеты, часопісы і лісты. 2) Добры і вясёлы паштальён Печкін развозіць пошту.

— Запішам гэты сказ.

— На ўроку мы дапаможам Печкіну размеркаваць канверты па паштовым скрыням.

На дошцы дзве паштовыя скрыні са словамі *так* і *не*, канверты са сцвярджэннямі:

1 — аднароднымі могуць быць дзейнікі, выказнікі і даданыя члены сказа;

2 — аднародныя члены сказанза звязаны толькі інтанацыяй пералічэння;

3 — паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска, калі яны звязаны інтанацыяй пералічэння, злучнікамі ***а, але*** і ***і,*** які паўтараецца;

4 — аднародныя члены сказа адказваюць на адно і тое ж пытанне, але звязаны па сэнсе з рознымі словамі;

5 — калі два аднародныя члены сказа звязаны злучнікам ***і***, то паміж імі ставіцца коска;

6 — у сказе ***Днём Маша чытала, малявала і пісала*** няма аднародных членаў сказа.

**VI. Работа з падручнікам.**

С. 64, пр. 101.

— Нам патрэбна ў кожнай групе сказаў з аднароднымі членамі знайсці лішні, выпісаць яго і растлумачыць свой выбар

— Чытаем першую групу сказаў. Які сказ лішні? Чаму? *(Другі сказ лішні, таму што ў ім аднародныя члены сказа звязаны злучнікам* ***але****, паміж імі ставіцца коска.)*

— Запішам яго на дошцы.

— Выбіраем адзін канверт. Чытаем сцвярджэнне. У якую скрыню пакладзем яго? Чаму?

— Чытаем другую групу сказаў. Які сказ лішні і чаму? *(Другі сказ, таму што аднародныя члены звязаны злучнікам* ***і****, які паўтараецца, а ў першым і трэцім сказах аднародныя члены звязаны толькі інтанацыяй пералічэння.)*

— Запішам сказ на дошцы.

— Дапамагаем паштальёну размеркаваць канверт. Чытаем сцвярджэнне. У якую скрыню яго адправім і чаму?

— Чытае трэцюю групу сказаў. Знаходзім лішні сказ. *(Лішні трэці сказ. У ім аднародныя члены звязаны толькі інтанцыяй пералічэння, у першым — злучнікам* ***і****, які паўтараецца, у другім — злучнікам* ***але****.)*

***Фізкультхвілінка (музычная).***

***Работа на картках.***

Двум вучням даюцца індывідуальныя карткі з заданнямі (*дадатак*).

С. 64, пр. 102.

— Прачытайце заданне да практыкавання 102. Зачытайце словы для даведкі. Чытаем сказ. Якое выдзеленае слова? Якія словы замест яго выкарыстаем? Запішам сказ. Якое слова выдзелена ў другім сказе? Як зменім

гэты сказ? Запішам яго. Якія словы для даведак выкарыстаем для трэцяга сказа? Запішам сказ.

Пасля таго як вучань запісаў сказ ля дошкі, выбірае канверт, чытае сцвярджэнне і адпраўляе яго ў патрэбную скрыню.

***Самастойная работа па падручніку.***

С. 65, пр. 103.

— Прачытайце і адгадайце загадку. Ці ёсць у ёй аднародныя члены сказа, назавіце іх. Самастойна спішыце загадку, растаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**VIII. Вынік урока.**

— Над якой тэмай працавалі? Што такое аднародныя члены сказа? Як звязаны паміж сабой аднародныя члены сказа? Калі паміж аднароднымі членамі сказа коска не ставіцца? Якім членам сказа яны могуць быць?

**IX. Рэфлексія.**

— «Чароўны куб». Прадоўжы сказ, які выпаў для цябе.

Па два вучні з рада кідаюць куб і працягваюць сказ:

1. Сёння на ўроку мне спадабалася…
2. Я даведаўся, што…
3. За працу на ўроку я хачу пахваліць…
4. Я не зразумеў…
5. На ўроку я працаваў…
6. Менш за ўсіх на ўроку працаваў…

**X. Дамашняе заданне.**

— Дома вам патрэбна выканаць пр. 105 на с. 65. Неабходна вызначыць межы сказаў, запісаць тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

*Дадатак*

***Варыянт 1***

1. Падкрэслі аднародныя члены сказа.

Крамяныя баравікі, ружовыя сыраежкі хаваюцца ў траве.

2. Дапоўні сказ аднароднымі членамі сказа.

У нашых лясах жывуць________________________________________

3. Пастаў, дзе трэба, коскі.

Вавёрка села на галінку некалькі разоў цокнула.

4. З дадзеных слоў і словазлучэнняў складзі і запішы сказы з аднароднымі членамі.

Асеннія апенькі, на, узбіліся, на, пні, узлескі, дрэў, ствалы.

***Варыянт 2***

1. Падкрэслі аднародныя члены сказа.

Махнаты чмель лятае, салодкі сок збірае.

2. Дапоўні сказ аднароднымі членамі сказа.

Дзеці збіралі ў лесе___________________________

3. Пастаў, дзе трэба, коскі.

На беразе ракі пахне свежасцю травой.

4. З дадзеных слоў і словазлучэнняў складзі і запішы сказы з аднароднымі членамі.

Узлесках, чырвонагаловыя, растуць, падасінавікі, духмяныя рыжыкі, на.